# Усмешка залатой восені

## Амаль лірычныя нататкі пра галоўнае

Пытанне на засыпку: у якую пару года наша Беларусь вам найбольш даспадобы і якая з іх нашай краіне, так бы мовіць, найлацвей падыходзіць? Ніколі не задумваліся?

Прадбачу чытацкую іронію: маўляў, што за глупства, знайшоў, называецца, тэму. Шчыра кажучы, раней таксама не ламаў сабе галаву над гэтым. Што тут разважаць?! Вясна, лета, восень, зіма – яны ў родным краі, на сваёй зямлі заўсёды жаданыя, па-свойму прыгожыя і адметныя. Варта толькі вочы расплюшчыць, душу адкрыць. І нават упарта даводзячы некаму, што лепш за ўсё ўлетку, апрыёры маем на ўвазе наша, беларускае лета, няхай сабе з паездкай на замежнае мора, але ўсё ж з радаснашчымлівым вяртаннем дадому.

Але чакайце… Неяк на пачатку кастрычніка ў абедзенны перапынак прагульваўся па набярэжнай Свіслачы ў цэнтры сталіцы. Дзень выдаўся як па замове – цёплы, сонечны, лагодны і ціхі, лёгка дыхалася і добра думалася. Залатая восень яшчэ толькі-толькі ўваходзіла ў свае правы і свае ўпрыгожванні розных адценняў залацістага хаатычна раскідала па клёнах і ясенях, і тыя палымнелі на фоне зялёных вербаў, што задумліва ўтаропіліся на сонную гладзь Свіслачы. Праз колькі дзён карціна зноў зменіцца, і восень паўстане перад намі ва ўсёй сваёй веліччы і бляску. Не тое што на поўдні Францыі, дзе мы некалі гасцявалі ў былой калегі, якая выйшла там замуж. Памятаю, спыталі ў гаспадыні, чаго ёй больш за ўсё нестае на чужыне. І зусім нечакана пачулі: восені,

**Восень у Гродне. З серыі БЕЛТА «Найлепшыя фота тыдня». Здымак Аксаны Манчук**



такой, як у нас, у Беларусі. Бо там як? Яшчэ вечарам дрэвы стаяць зялёныя, а назаўтра раніцай ужо голыя, а пад імі чорна-карычневы дыван апалага лісця. Ні воку парадавацца, ні душы ўсцешыцца!

Беларуская восень зачароўвае не толькі сваёй прыгажосцю. Яна нетаропкая, не спяшаецца раскрыць свае загатоўкі і таямніцы, інтрыгуе і ўлагоджвае адначасова. Нечым нагадвае нашых людзей, што не прывыклі спяшацца, на хаду прымаць неабдуманыя, сумнеўныя рашэнні альбо кідацца ў нейкія авантуры. Яшчэ восень сваім спакоем і ўраўнаважанасцю спакваля схіляе задумацца пра вечныя каштоўнасці і заняцца справамі, да якіх не даходзяць рукі ў іншы час. Часам агорне светлы сум, бо разам з асенняю парою сыходзіць яшчэ адзін год нашага жыцця, і тады пранізліва разумееш, як гэта невымоўна добра – ісці ўздоўж маляўнічай рэчкі, з павуцінкай у валасах, пад высокім мірным небам ці паліць высахлы бульбоўнік і, як у дзяцінстве, закінуць у прысак адну-другую бульбіну. Альбо прайсціся па сцішаным лесе, затоена слухаючы меладычны шоргат лісця, што няўмольна сыплецца з дрэў. Потым на ўзлеску дыхаць на поўныя грудзі восеньскай прахалодай і любавацца маляўнічымі даляглядамі, якія лашчацца пад скупаватым кастрычніцкім сонцам. І думаць пра тое, што гатовы аддаць усё за гэта шчасце – адчуваць сябе часцінкай сваёй Беларусі, гаспадаром на лапіку роднай зямлі. І калі што, то ўстанеш бараніць гэты край ад лёзных людзей.

Восень – незвычайная пара, час кантрастаў. Яна залівае дажджом і адорвае сонечнай пяшчотай, зачароўвае прыродным хараством і пужае туманамі і панурасцю. Вельмі падобна на наша жыццё, у якім хапае ўсяго: і добрага, і не надта прыемнага, часам драматычнага. Але восень не злая, яна жыццесцвярджальная і дорыць нам надзею. Сціпла намякае: усё паўторыцца зноў, кола жыцця не супыніць свой бег. А бабіна лета, гэтая ўсмешка залатой восені, звыклы, але ўсё роўна заўсёдны цуд! Яно з'яўляецца звычайна пасля слаты і холаду і быццам сімвалізуе, што пасля складанага і напружанага часу настае добры і спрыяльны. Мая бабуля, светлая ёй памяць, лічыла бабіна лета за Божы дар, і калі яно было надта кароткім, вельмі проста знаходзіла прычыну: маўляў, людзі шмат награшылі.

Чамусьці менавіта восенню найчасцей цягне на малую радзіму. Можа, толькі ў мяне так? Папытаў у сяброў і знаёмых. Не, кажуць, не толькі ў цябе гэта прыцягненне. Вось і едуць асеннімі дарогамі да старых бацькоўскіх хат беларусы. Ужо нярэдка, як тыя лусты з хлебнага бохана, – адрэзаныя і вольныя, але ж быццам прымацаваныя нейкай нябачнай волатаўскай сілай да родных мясцін. Дый восень падкідвае нямала практычных прычын праявіць клопат пра малую радзіму: трэба і ўраджай дапамагчы ўладкаваць, і плот падправіць, і ці мала што яшчэ спатрэбіцца па гаспадарцы. І нават калі ехаць ужо няма да каго, усё адно прыязджаюць – да родных магіл. На Дзяды на могілках людзей бывае не менш, чым на Радуніцу. А вось размовы крыху іншыя, больш філасофскія, ці што. Мабыць, восень схіляе паразважаць пра жыццё і смерць, сэнс чалавечага існавання і лёс Радзімы. Можа, яно і нядобра – разводзіць дыскусію на могілках у святы дзень, але аднойчы так разгаварыліся з вяскоўцамі, што я па журналісцкай звычцы нават пашкадаваў, што не захапіў з сабой дыктафон. Якія светлыя і харошыя думкі ў простых людзей! У той момант неяк вельмі пранізліва адчуў роднасную еднасць з імі, з мясцінамі, дзе вырас.

Мо я і люблю восень найперш таму, што яна дае ні з чым не параўнальнае адчуванне роднай зямлі, нашай Беларусі, і ўласнай прыналежнасці да яе.

А гэта галоўнае, ці не так?

***Ігар ГАНЧАРУК***